АД АЎТАРА

У 1999 годзе ў Нью-Ёрку выйшла кніга «Беларуская мэмуарыстыка на эміграцыі». Яна складалася з уласна дасьледаваньня й дадатку. Матэрыялы, зьмешчаныя ў дадатку, ня толькі ілюстравалі тэарэтычныя палажэньні дасьледаваньня, але мелі і вартасьць гістарычных дакумэнтаў эпохі. Бальшыня зь іх — рукапісы са спадчынных архіваў, некаторыя — публікацыі з пэрыядычных выданьняў, амаль недаступных сёньняшняму чытачу. У дадатку былі зьмешчаныя ўспаміны Апалёніі Радкевіч «Беларуская хатка», Сямёна Підгайнага «Беларусы на Салаўках», Юркі Віцьбіча «Не чарнілам, а крывёю» ды «Люблю я, разумееце, Віцебск», айца Льва Гарошкі «Праз навальніцы й нягоды», Зінаіды Кадняк «Успаміны пра Алеся Салаўя», Аляксандра Калодкі «Беларусы ў Аўстраліі»; жыцьцяпісы, аўтабіяграфічныя нарысы Натальлі Арсеньневай, Канстанціна Езавітава, Міколы Равенскага, Вячаслава Сэлях-Качанскага, Алеся Змагара, Уладзімера Брылеўскага, Юрыя Жывіцы.

Пасьля выхаду кнігі асваеньне й публікацыя беларускай эміграцыйнай мэмуарастыкі працягвалася; у «Запісах БІНіМ», № 24, 1999, былі апублікаваныя «Зацемкі на маргінэсе найноўшае гісторыі» з успамінамі а. Л. Гарошкі, А. Савёнак, аўтабіяграфіяй С. Хмары й ліставаньнем Вольгі Таполі; выдрукаваныя гутаркі з М. Ганько й В. Навіцкім (Юрэвіч Л. Вырваныя бачыны. Мн., 2001), успаміны А. Клёнава, аўтабіяграфія Янкі Юхнаўца (Юрэвіч Л. Літаратурны рух на эміграцыі. Мн., 2002), аўтабіяграфія і ўспаміны Антона Адамовіча (Адамовіч Ант. Творы. Нью-Ёрк, 2003), разьдзел успамінаў Зоры Кіпель («Запісы БІНіМ», № 27, 2004), распачата публікацыя дзёньнікаў Янкі Юхнаўца (тамсама).

Кніга «Беларуская мэмуарыстыка на эміграцыі» знайшла свайго чытача — як на Захадзе, так і ў Беларусі, наклад разышоўся, і паўстала патрэба другога выданьня. У новым выданьні дапоўнена дасьледаваньне; зьмешчаны бібліяграфія мэмуараў,

друкаваных у газэтах «Бацькаўшчына» й «Беларус» ад часу іхнага заснаваньня да 2000 году, і бібліяграфія нэкралёгаў і паведамленьняў пра сьмерць суайчыньнікаў — своеасаблівыя ўспаміны пра блізкіх памерлых («Жалобная хроніка»). У кнізе — поўная публікацыя незавершаных успамінаў Уладзімера Дудзіцкага й ліставаньня Вольгі Таполі. Выбар гэтых мэмуарных матэрыялаў дыктаваўся як багацьцем іхнага зьместу, так і выразнай жанравай адметнасьцю. Успаміны Дудзіцкага — на сумежжы мэмуараў і мастацкага твору. Лісты Таполі — яскравы прыклад вялікіх магчымасьцяў ліставаньня як мэмуарнага жанру: трагедыя жаночага лёсу раскрываецца і праз аўтабіяграфічныя нататкі, і ўспаміны, і дзёньнікавыя запісы.

Кніга «Мэмуары на эміграцыі» прысьвячаецца сьветлай памяці Зоры Кіпель.